каагенс (0,3 %). Роля паказчыкаў семантыкі абумоўлена законам семантычнага ўзгаднення: большасць кампанентаў з прасторавым значэннем, а таксама фінітыў-1, фінітыў-4, дыменсіў-1, дыменсіў-3, медыятыў-3 і спосаб спалучаюцца толькі з дзеясловамі лексіка-семантычнай групы руху.

Спосабы выражэння кампанентаў, што ўваходзяць у склад мадэлей, самыя розныя. Найбольш часта дырэктыў-старт, дырэктыў-фініш, транзітыў выражаюцца назоўнікамі, значна радзей – прыслоўямі і займеннікамі. Агенс выражаецца рознымі формамі займенніка або назоўніка ці імпліцытна. Фінітыў і медыятыў выражаюцца пераважна назоўнікамі, дыменсіў і спосаб – прыслоўямі.

## 3.2 Экзістэнцыяльна-лакатыўны

Эліптычныя сказы са значэннем статальнай лакалізацыі ўжываюцца даволі часта ў творах мастацкай літаратуры. Гэта тлумачыцца тым, што яны ўжо на ўзроўні сінтаксічных кампанентаў утвараюць тыповую сітуацыю. Дзеяслоў са статальным значэннем апускаецца часцей за іншыя, што выклікана камунікатыўным заданнем эліптычнага сказа – паказаць месца размяшчэння аб’екта або проста ўказаць на яго наяўнасць. Дамінуючым кампанентам у рэалізацыі семантыкі выступае *лакатыў*: *У куце на саломе – цяля з засохлым кончыкам пупавіны* (А. Карпюк); *На стозе – бусел макаўкаю лета* (М. Стральцоў); *У многіх на злінялых прапацелых гімнасцёрках – ордэны* (С. Грахоўскі).

Мадэль эліптычнага сказа з семантыкай статальнай лакалізацыі ўключае наступныя кампаненты: ***экзісцыенс – прэдыкат – лакатыў***.

Пазіцыя лакатыва са статальным значэннем часцей за ўсё знаходзіцца ў абсалютным канцы сказа: *На абеліску – твой апошні ордэн* (С. Законнікаў); *На беразе – белыя цвеці* (Я. Крупенька); *Зіма… Зіма… У палях – туманы* (П. Трус). Выражаецца экзісцыенс пераважна назоўнікам ці асабовым займеннікам, пры гэтым эліптычныя сказы могуць набываць форму пытальнага сказа: *Гаспадар – у хаце?* (І. Мележ).

Эліптычныя канструкцыі *са значэннем статальнай лакалізацыі ў межах прасторавага арыенціра* ўключаюць эліпсаваны дзеяслоў і два матэрыяльна выражаныя кампаненты. Адметнасць семантыкі такіх сказаў заключаецца ва ўказанні на канкрэтны прасторавы арыенцір, прычым экзісцыенс можа выражацца імпліцытна: *Агеньчык у цемры* («Дзеці і мы»); *Там, за Днепрабугам* («Ленінскі шлях»); *Твае салдаты тут, у акопах* (А. Дудараў); *Станцыя. Я ў цягніку* (М. Сяднёў). Лакатыў у дадзеных канструкцыях можа выражацца самымі рознымі спосабамі – формамі назоўніка: *Пад небам беларускага слова* (ЛіМ); *Святло далёкай зоркі – над вадой* (А. Грачанікаў); *Альпійская ружа – у нава-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*коллі Ружкавіч* («Адкрыты ўрок»); *Пад Мінскам – аўцюкоўцы* («Дзеці і мы»); *На скрыжаванні – чарада рабін. // І раптам надпіс: «Сцеражыся мін»* (А. Бажко); *Іду. З нябёс глядзіцца месяц. // У прасторы ноч і ціхі сон* (З. Астапенка); *На сценах – дарагія дываны, дарагі абажур, дарагая мэбля* (Г. Марчук), займенніка: *На ім – чорная шапка з капюшонам, на нагах – чорныя бітыя валёнкі, на руках – сінія рукавічкі* (А. Жук), прыслоўямі: *Насустрач – даліна, мурожная траўка. // За лугам – магільнік, Хмызняк і багна* (З. Бядуля); *Мальвіна дома?* (Б. Сачанка). Экзісцыенс, выражаны назоўнікам, указвае на неадушаўлёны аб'ект: *І на праспектах і плошчах яго – // Белыя, белыя ліпы* (С. Грахоўскі); *Алтар у лесе* («Ave Maria»); *Славутасці Міншчыны ў цэнтры Гродна* («Звязда»); *У пакоі зімна. На шыбах – кветкі* (М. Рудакоўскі); *Вось на ўзгорку – пяцісценны дом // З шыльдаю кароткай «Чайная»* (П. Глебка).

Эліптычныя сказы са значэннем статальнай лакалізацыі могуць указваць на аб'ект, што размяшчаецца ***па-за межамі прасторавага арыенціра***. Адметнасць дадзеных канструкцый у форме лакатыва, які заўсёды выражаецца назоўнікамі з прыназоўнікамі ***за***: *За леснічоўкай – маляўнічае возера* («Паляўнічыя рыбалоў Беларусі»); *А за вокнамі – чырвоны чэрвень* (М. Калачынскі); *Вёска Журоўка – за невялічкім, але маляўнічым возерам* («Беларускі час»); *За вокнамі агні і чорны снег* (А. Вялюгін), ***каля (ля)***: *Мы каля старадаўняга алтара* («Ave Maria»); *Ля вогнішча – думаў натхнёных запал і песень разліў пераможны* (Л. Геніюш); *Каля хаты – маладая грушка* (Б. Мікуліч); *Гурбы снегу – ля вакон* (У. Скарынкін); *Шыпшыны куст – ля хаты – на шляху* (Р. Баравікова), ***над***: *Над ракою – дзве вярбіны, // Дзве журботныя сястры* (Я. Янішчыц); *Над галавой спакойнаеі добрае, як матчын твар, – жнівеньскае сонца* (С. Законнікаў); *Над зямлёй – спелых яблык духмяны разліў* (В. Іпатава); *Над Чорным морам, нада мной – // Начнога неба перфакарта* (У. Скарынкін); *Над дзюнамі сонныя сасонкі – парасонамі* (А. Вялюгін); *Над шэрай хатай матчынай – // І сум, і яснота* (А. Іверс); *Над возерам – аблокі* (П. Галавач), ***абапал*** (***наабапал, паабапал***): *...Абапал лясной паляны – дубы* (А. Карэлін), ***перад***: *Перад намі – шырокі прастор* (В. Таўлай); *І палкоўнікава постаць у яго перад вачыма* (П. Броўка), ***побач***: *Побач – поле ўзаранае. Шырокія барозны працягнуліся* (В. Каваль); *Побач са сталом – канапа* (А. Макаёнак), ***вакол (навокал)***: *А навокал – бязлессе* (С. Грахоўскі); *А вакол – узлескі ясныя* (А. Вялюгін), ***пры***: *Пры лазні – цырульня* (С. Грахоўскі); **імпліцытна**: *Маўзер – справа, шабля – злева* (А. Бялевіч); *Дарожка. Елкі – злева, справа. // Працяглы шум. Савіны куст* (А. Бялевіч).

У сінтаксічнай сістэме беларускай мовы маюць месца эліптычныя сказы з семантыкай статальнай лакалізацыі ***паміж прасторавымі арыенцірамі***. У іх семантыка рэалізуецца з дапамогай прыназоўнікаў ***між (паміж)***: *Між міфам і сном* (ЛіМ); *Паміж вёскамі – млын-вятрак без крылаў. Паабапал – аскаболкі жорнавых каменняў...* (А. Кулакоўскі); *Між вёсак – маляўнічае возера* (А. Аст-

РЕПОЗИТОРИЙ•БГПУ

рэйка); *Між ялін – вялікі будан* (А. Бялевіч); ***сярод***: *Сярод іх – і мой няроўны почырк* (Р. Баравікова). Такія сказы часта выкарыстоўваюцца ў загалоўках да інфармацыйна-публіцыстычных твораў: *Шляхта – сярод нас* (ЛіМ); *Зялёны астравок пасярод планеты* (ЛіМ). У назвах экзісцыенс можа выражацца імпліцытна: *Паміж ідэяй і бізнесам* («Настаўніцкая газета»). Структура сказаў з семантыкай статальнай лакалізацыі можа пашырацца за кошт увядзення факультатыўных кампанентаў – ***каэкзісцыенса***: *Маці з дзецьмі – у хаце* (Янка Брыль); ***тэмпаратыва***: *Зноўку туманы над полем* (Кузьма Чорны) або ***сірканстантаў са значэннем спосабу дзеяння***: *Крэкча дуб: // – Душ мне люб. // Па каленкі // У лужах елкі* (А. Пысін).

Часам пропуск дзеяслова ў эліптычных сказах абумоўлены метрыка-рытмічнай арганізацыяй верша: *З лета – стог, абкладзены кляёнкай, // На штыкетах – жоўтыя глякі… // Недзе мама бразгае даёнкай, // Недзе тата носіць смалякі…* (Р. Баравікова); *У кожным сэрцы – маладых запал* (А. Куляшоў); *І сярод іх – адна – уся з агню* (Р. Баравікова).

Такім чынам, эліптычныя канструкцыі са значэннем статальнай лакалізацыі (прааналізавана 1238 адзінак) маюць структурна-семантычныя адметнасці, якія заключаюцца ў характары прэдыката. Значэнне статальнай лакалізацыі, што ўласціва эліпсаванаму прэдыкату, абумоўлівае характар семантычных кампанентаў. Мадэль эліптычных канструкцый трохкампанентная (мінімальная): уключае экзісцыенс, статальны прэдыкат і лакатыў. ***Высокай ступенню частотнасці*** характарызуюцца мадэлі: экзісцыенс – прэдыкат – лакатыў (у межах прасторавага арыенціра) (46 %), экзісцыенс – прэдыкат – лакатыў (па-за межамі прасторавага арыенціра) (24 %). Да мадэлей з ***нізкай ступенню частотнасці*** адносяцца: экзісцыенс – прэдыкат – лакатыў (паміж прасторавымі арыенцірамі) (16 %), экзісцыенс – прэдыкат – лакатыў – тэмпаратыў (5 %), экзісцыенс – прэдыкат – лакатыў – спосаб (5 %), экзісцыенс – каэкзісцыенс – прэдыкат – лакатыў (4 %) (рысунак 3.3).

Да ***высокапрадуктыўных*** (дадатак Б.2) адносяцца мадэлі: экзісцыенс – прэдыкат – лакатыў (у межах прасторавага арыенціра) (10), экзісцыенс – прэдыкат – лакатыў (па-за межамі прасторавага арыенціра) (5) (рысунак 3.4).

Да ***малапрадуктыўных*** адносяцца мадэлі: экзісцыенс – прэдыкат – лакатыў (паміж прасторавых арыенціраў) (3), экзісцыенс – прэдыкат – лакатыў – спосаб (3), экзісцыенс – каэкзісцыенс – прэдыкат – лакатыў (1), экзісцыенс – прэдыкат – лакатыў – тэмпаратыў.

У якасці паказчыка семантыкі выступаюць (дадатак Г.2) лакатывы (100 %), якія маюць спецыфічную граматычную форму – роднага, меснага або творнага склонаў. Спецыфічнасць склонавых форм выражэння лакатываў праяўляецца ў параўнанні з формамі выражэння іншых кампанентаў з прасторавым значэннем (дырэктыў-старт, дырэктыў-фініш, транзітыў і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




**Рысунак 3.3. – Экзістэнцыяльна-лакатыўны тып: частотнасць мадэлей**




**Рысунак 3.4. – Экзістэнцыяльна-лакатыўны тып: прадуктыўнасць мадэлей**

Названыя формы выражэння лакатываў падразумяваюць іх спалучэнне выключна з дзеясловамі з семантыкай статальнай лакалізацыі (а не з семантыкай руху ці перамяшчэння ў прасторы). Лакатывы выступаюць надзвычай выразным сродкам рэалізацыі семантыкі статальнай лакалізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ•БГПУ

Лакатывы выражаюцца пераважна назоўнікамі або займеннікамі, радзей – прыслоўямі. Экзісцыенс прадстаўлены назоўнікамі або займеннікамі, тэмпаратыў і спосаб – назоўнікамі або прыслоўямі. Неабходна адзначыць, што эліптычныя канструкцыі з семантыкай статальнай лакалізацыі даволі шырока выкарыстоўваюцца ў творах мастацкай літаратуры і ў публіцыстыцы, што абумоўлена іх сэнсавай адназначнасцю і канстантнай маркіроўкай катэгорыі статальнасці.

## 3.3 Лакатыўна-пацыентыўны

Адметнасць эліптычных канструкцый з семантыкай перамяшчэння ў прасторы заключаецца ў тым, што ў іх працэс перамяшчэння накіраваны на аб’екті прыводзіць да змены яго дынамічнай лакалізацыі: *Любую дравінку – у касцёр* (П. Броўка); *А нас – у лагер* (А. Дудараў).

Семантыка перамяшчэння ў прасторы найперш рэалізуецца ў мадэлі ***агенс – прэдыкат – пацыенс – дырэктыў-фініш***. Наяўнасць пацыенса абумоўлена абавязковай рэалізацыяй дзеяння суб’екта ў дачыненні да аб’екта: – *Мама, вы мяне… на наша любімае месца, – ціха сказала Галіна* (Г. Багданава). Пацыенс рэалізуецца ў сінтаксічнай пазіцыі дапаўнення і выражаецца назоўнікам або займеннікам у форме вінавальнага склону: – *Дзяцей трэба ў школу* (Б. Сачанка). У якасці паказчыка семантыкі выступае пацыенс, які ўказвае на аб’ект перамяшчэння: – *Куды нас?* (Б. Сачанка) або суб’ект сумеснага дзеяння: *Зрабіць я, канечне, нічога не мог… Мне трэба было з імі разам* (А. Дудараў).

Калі ў структуру канструкцыі з эліпсісам дзеяслова ўваходзіць тэмпаратыў, тады семантыка перамяшчэння рэалізуецца ў мадэлі ***агенс – прэдыкат – пацыенс – тэмпаратыў – дырэктыў-фініш***: *Летам дзяцей – на аздараўленне* («Ленінскі шлях»); *Цяпер мы цябе дадому* (Г. Багданава). Пашырэнне семантычнай структуры сказа дазваляе некаторым кампанентам набываць імпліцытнае выражэнне.

Перамяшчэнне ў прасторы можа ажыццяўляцца ад пачатковага пункта да канечнага. Мадэль сказаў у такім выпадку будзе наступная: ***агенс – прэдыкат – аб’ектыў – дырэктыў-старт – дырэктыў-фініш***, а спосабы выражэння аб’екта аднатыпныя – гэта пераважна назоўнікі ў форме вінавальнага склону або субстантываваныя формы: *Боршч і бабку з печы – на стол* (А. Кулакоўскі).

Калі ў склад эліптычнага сказа ўваходзіць сірканстант са значэннем мэты, то ў такім выпадку мадэль канструкцыі ўключае наступныя кампаненты: ***агенс – пацыенс – прэдыкат – каўзатыў – дырэктыў-фініш***, дзе агенс выражаецца імпліцытна: *Нашто ты яго туды?* (А. Дудараў).

Мадэль ***агенс – прэдыкат – аб’ектыў – тэмпаратыў*** уласцівая канструкцыям, у якіх акцэнт робіцца на тэмпаральных характарыстыках. У такіх выпад-

РЕПОЗИТОРИЙ•БГПУ